должен быть готов к этому сложному периоду в своей жизни. На наш взгляд, стимулирование рефлексивных процессов именно на втором курсе будет способствовать успешному прохождению этого периода. "Тетрадь самопознания" может стать инструментом саморазвития и самовоспитания, стимулировать формирование психологической готовности к профессиональной деятельности.


1. *Карпов, А. В.* Рефлексивность как психическое свойство и методика ее диагностики // Психологический журнал. – 2003. – Т. 24, № 5. – С. 45–57.

2. *Дьяченко, М. И.* Готовность к деятельности в напряженных ситуациях: Психологический аспект / М. И. Дьяченко, Л. А. Кандыбович, В. А. Пономаренко. – Мн.: Университетское, 1985. – 206 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


**В.А. Гуліцкая,** *дацэнт,*
**А.М. Пісарэнка,** *дацэнт*


## ШЛЯХІ ПАВЫШЭННЯ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Самастойную работу студэнтаў пры арганізацыі вучэбнага працэсу трэба разглядаць як дамінанту, якая вызначае эфектыўнасць прафесійнай падрыхтоўкі навучэнцаў. Таму практычна ўсе віды навучальнай дзейнасці павінны быць арыентаваны перш за ўсё на стымуляванне і актывізацыю пазнавальнага працэсу, якія немагчымы без самастойнага пошуку.

Задача педагога – не "перадаваць веды", іх практычна перадаць нельга. Яго задача – матывацыя самастойнай творчай работы студэнтаў, аптымізацыя іх прафесійнага станаўлення. Яго роля вызначаецца ўменнем стварыць для гэтага аптымальныя ўмовы, а таксама наладзіць кантроль за эфектыўнасцю набыцця ведаў. Формы кантролю могуць быць розныя: прагляд і аналіз студэнцкіх канспектаў і чытацкіх дзённікаў, правядзенне віктарын і гутарак пра вынікі самастойных распрацовак, праверка анатацый,

тэстаў і рознаўзроўневых заданняў тэставага характару, абмеркаванне рэфератаў і кантрольных работ, абарона курсавых і дыпломных праектаў і інш.

Выніковасць самастойнай работы залежыць ад многіх фактараў. Безумоўна, вялікае значэнне мае здольнасць студэнта самастойна і мэтанакіравана працаваць, не толькі мець дастатковы запас канкрэтных звестак па тых ці іншых галінах ведаў і ўмець іх прадэманстраваць, але і здольнасць вырашаць творчыя задачы.

Для паспяховай вучобы кожнага студэнта важна мабілізаванасць усёй групы на творчую працу. У гэтым бачыцца і адна з задач куратараў груп, вопыт якіх варта вывучаць і рэгулярна абмяркоўваць на кафедрах.

Вядома, што кожны вучэбны прадмет – гэта не толькі аб'ём канкрэтных ведаў, але і прастора для творчага самавыяўлення. А такая ўстаноўка ў першую чаргу забяспечваецца прафесіяналізмам выкладчыкаў. Нельга прыйсці ў групу і загадаць студэнтам уключыцца ў творчую самастойную работу. Студэнты заўсёды ацэньваюць адносіны самога выкладчыка да свайго прадмета. Калі яны фармальныя, ніякія патрабаванні не прымусяць студэнта працаваць з аддачай. Але калі выкладчык сам чалавек творчы, гэта найлепшы прыклад для студэнтаў. Іх ужо не задавальняюць заданні, выкананне якіх патрабуе толькі механічнага замацавання атрыманых ведаў (прачытаць гэта, напісаць тое). Студэнты лічаць, што іх пазнавальныя здольнасці будуць удасканальвацца, калі змест вучэбнага задання накіраваны на самастойны пошук новай інфармацыі, якая потым спатрэбіцца ў будучай прафесійнай дзейнасці. Гэтаму спрыяюць правядзенне практычных, семінарскіх заняткаў у форме дзелавых гульняў, спаборніцтваў на хуткі пошук памылак з выкарыстаннем "сігнальных картак", сюжэтна-дыдактычныя заданні, спалучэнне тэарэтычных і практычных ведаў у заданнях па самастойнай рабоце, распрацоўка інтэграваных міжпрадметных заданняў, падрыхтоўка самастойных заданняў даследчага характару, а таксама свабодны выбар заданняў, узаемнае рэцэнзаванне ці групавая ацэнка самастойных студэнцкіх работ, добра падабраныя тэставыя заданні, рэйтынгавы кантроль, інавацыйныя формы правядзення экзаменаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і залікаў, узаемасувязь паміж самастойнай працай і рэйтынгам студэнта.

Навучэнцы чакаюць ад выкладчыка індывідуальнай ацэнкі сваёй працы, дэталёвага аналізу, канкрэтнага меркавання. Ім хочацца не толькі атрымаць адзнаку, але і паразважаць, нават падыскуціраваць на роўных з выкладчыкам.

Але падобныя формы выкладчыцкай працы патрабуюць шмат часу для індывідуальных кантактаў. Як адзначае Н.М. Дзядзюля ў артыкуле "Самастойная работа ў педагагічнай ВНУ" (часопіс "Адукацыя і выхаванне"), у ВНУ ЗША вялікае значэнне надаецца кансультацыйнай рабоце выкладчыкаў са студэнтамі, важным элементам якой з'яўляецца дыферэнцыраванае кіраўніцтва самастойнай работай навучэнцаў. Кансультацыйная нагрузка нашых выкладчыкаў нярэдка перавышае іх нагрузку, якая прыпадае на лекцыі і практычныя заняткі. Таму не на карысць павышэнню эфектыўнасці працэсу навучання тэндэнцыі, характэрныя для многіх нашых установ: павелічэнне гадавой выкладчыцкай нагрузкі, колькасці студэнтаў у акадэмічных групах, стварэнне вялікіх плыняў, змяншэнне, а то і зусім скасаванне гадзін на кансультацыі. А яшчэ трэба ажыццяўляць і розныя віды кантролю: бягучы (апытанне, міні-апытанне, выбарачны кантроль, пісьмовыя кантрольныя работы, міні-кантрольныя, розныя гульні, віктарыны, красворды, тэсты і інш.), тэматычны кантроль (апытанне студэнтаў па тэме ці раздзелу вучэбнай праграмы), рубежны штомесячны кантроль, а таксама выніковы, які ажыццяўляецца на экзамене, і заключны, што праводзіцца ў складзе камісіі на дзяржаўным экзамене.

Правядзенне кантролю таксама патрабуе ўдасканалення. Як паказвае вопыт, сённяшніх студэнтаў не задавальняе вельмі моцны, на іх погляд, псіхалагічны прэсінг фармальнага кантролю, не падабаецца ім "татальнасць" кантролю, а тым больш "беглы" ці 5-хвілінны кантроль. Ім імпануе не кантроль-адзнака, а кантроль-ацэнка іх ведаў, уменняў, здольнасцей, іх слабых і моцных месцаў як будучых спецыялістаў.

Значыць, эфектыўнасць самастойнай работы студэнтаў залежыць ад максімальна дакладнай яе арганізацыі, ад аптымальнага кіраўніцтва з боку выкладчыка, наяўнасці адваротнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сувязі, што звычайна звязваюць з сістэмай рэйтынгу навучэнца або татальным выкладчыцкім кантролем.

З вышэйсказанага вынікае, што ў арганізацыі самастойнай работы навучэнцаў вялікая роля адводзіцца выкладчыку. Але сёння педагог перастае быць манапалістам у галіне ведаў. Кнігі і словы педагога павінны дапаўняць, паглыбляць тыя веды, якія можна атрымаць праз такія формы інфармацыі, як камп'ютэр, відэазапіс, тэлебачанне. Слова выцясняецца вобразам. Таму важным метадам стымуляцыі пазнавальнай актыўнасці студэнтаў з'яўляецца выкарыстанне модульнай аўдыёвізуальнай тэхналогіі, якая дапаўняе вербальны метад педагагічнага ўздзеяння. Сёння ўжо можна гаварыць, што ў наш час найбольш эфектыўным сродкам вучэбнага працэсу з'яўляецца камп'ютэрызацыя, пры якой дасягаюцца розныя мэты. Камп'ютэр стымулюе станоўчую матывацыю ў адносінах да навучання і пазнавальнай дзейнасці, дапамагае ажыццявіць міжпрадметныя сувязі, забяспечыць індывідуальны падыход у працэсе навучання. Пераход ВНУ на якасна новую ступень арганізацыі вучэбнага працэсу і самастойнай работы немагчымы без выкарыстання камп'ютэраў і сучасных інфармацыйных тэхналогій.

Думаецца, што хутка настане час карыстання электроннымі рэсурсамі бібліятэкі свайго ВНУ праз персанальныя камп'ютэры ў лабараторыях і кабінетах, а таксама праз дамашнія персанальныя камп'ютэры. Праз сервер бібліятэкі карыстальнікі атрымаюць доступ да інфармацыйных рэсурсаў іншых ВНУ, бібліятэчна-інфармацыйных установаў замежных краін.

А для гэтага трэба тэрмінова распрацоўваць новыя інструктыўна-метадычныя, даведачныя матэрыялы, практычныя дапаможнікі, актывізаваць сумесную дзейнасць тэхнічных кафедраў з іншымі кафедрамі па ўкараненні сучасных методык тэхнічнага забеспячэння вучэбнага працэсу; знайсці сродкі матэрыяльнага забеспячэння кафедраў неабходнай колькасцю адпаведнай апаратуры; прадугледзець абнаўленне падручнікаў, забяспечыць вучэбны працэс дапаможнікамі, навукова-метадычнай літаратурай, камп'ютэрнымі базамі даных; зацікавіць студэнтаў новымі ідэямі, тэхналогіямі і прафесійна арыентаванамі творчымі заданнямі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

павялічыць колькасць гадзін на арганізацыю індывідуальнай дапамогі студэнтам і кантроль за самастойнай работай.

З улікам гэтых фактараў можна разлічваць на істотнае паляпшэнне ведаў навучэнцаў, павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў адпаведна запатрабаванням сучаснага грамадства.

**С.В. Гутковская**, *доцент*

## ОСНОВНЫЕ ФОРМЫ САМОСТОЯТЕЛЬНОЙ РАБОТЫ СТУДЕНТОВ-ХОРЕОГРАФОВ

(кафедра хореографии)

Профессиональная деятельность кадров, работающих в сфере культуры Беларуси, наполняется сегодня качественно новым содержанием, что в первую очередь обусловлено социально-экономическими преобразованиями, происходящими в обществе. В системе образования идет естественный процесс реформирования, проявляющийся в кардинальном изменении содержания и форм обучения, переосмыслении его целей и задач. Это также относится и к процессу подготовки кадров в сфере хореографического искусства.

Подготовка высококвалифицированных специалистов в области культуры и искусства, способных создавать новые художественные ценности, сегодня требует продуктивной познавательной деятельности студента, которая выражается в самостоятельном приобретении ими знаний. Следовательно, качество подготовки современного специалиста зависит не только от рационализации учебно-воспитательного процесса и мастерства преподавателей, но в значительной степени – от эффективности самостоятельной внеаудиторной деятельности студентов по приобретению и закреплению знаний, умений и навыков, упорства, целеустремленности в постоянном совершенствовании себя как личности [3, с. 3].

Значимость самостоятельной работы студентов в общей системе подготовки специалистов определила повышенный интерес ученых и преподавателей вузов к теоретическим и

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ